**Далінская Л.І.,**
аспірантка кафедры
бібліяграфіі і дакументазнаўства

# БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПА ПЕДАГОГІЦЫ І ПСІХАЛОГІІ НА БЕЛАРУСІ: СУЧАСНЫ СТАН

Паспяховая рэалізацыя ідэй і прынцыпаў рэформы сучаснай адукацыі немагчымая без удасканалення інфармацыйнай структуры адукацыйнай прасторы Рэспублікі Беларусь. У апошні час пачала складвацца новая інфармацыйная інфраструктура, якая характарызуецца наступнымі асноўнымі асаблівасцямі:

— аб'яднаннем традыцыйных і новых інфармацыйных бібліятэчных тэхналогій;

— узнікненнем і развіццём інфармацыйна-прадметных асяродкаў для педагогаў, псіхолагаў і сацыяльных педагогаў;

— значным узрастаннем патрэб гэтых катэгорый спецыялістаў у тыражаванні інфармацыі на разнастайных носьбітах;

— павелічэннем ролі электронных інфармацыйных сродкаў;

— з'яўленнем сродкаў тэлекамунікацый і тэхналогій, што садзейнічаюць пашырэнню інфармацыйных сувязей са знешнімі крыніцамі інфармацыі.

У апошні час адбываецца працэс узнікнення новай галіны педагагічнай навукі — інфармацыйнай педагогікі. Апошняя складаецца з пытанняў збору, захавання, пошуку, перапрацоўкі, пашырэння і выкарыстання інфармацыі ў навучальным, выхаваўчым і кіраўніцкім працэсах. У Рэспубліцы Беларусь распрацаваны дзяржаўныя праграмы "Інфарматызацыя сістэмы адукацыі" і "Настаўнік", зацверджаныя ўрадам краіны.

У наш час галіновы бібліяграфічны комплекс па педагогіцы і псіхалогіі складаецца з бягучых паказальнікаў



Репозиторий БГУКИ

новых наступленняў, навукова-дапаможных бібліяграфічных паказальнікаў (агульнагаліновых, комплексных, тэматычных, паказальнікаў прац навуковых установ і ВНУ, біябібліяграфічных і персанальных). Усе гэтыя віды выданняў забяспечваюць педагогіку і псіхалогію шматаспектнай інфармацыяй з шырокім ахопам крыніц. Паказальнікі адрозніваюцца ў асноўным метадамі бібліяграфавання і зместам дакументаў, якія яны адлюстроўваюць.

На сучасным этапе ў Беларусі існуюць наступныя цэнтры, што ажыццяўляюць бібліяграфічнае інфармаванне педагогаў і псіхолагаў: Рэспубліканская навукова-педагагічная бібліятэка (РНПБ), Нацыянальны інстытут адукацыі (НІА), Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ), Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання (НМЦ ВК і СН), Акадэмія паслядыпломнай адукацыі (АПА), Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі (РІПА), абласныя інстытуты ўдасканалення кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі, некаторыя педагагічныя універсітэты.

Сёння РНПБ з'яўляецца галіновым бібліяграфічным цэнтрам распрацоўкі доўгатэрміновай міжведамаснай мэтавай комплекснай праграмы развіцця беларускай бібліяграфіі. Інфармацыйны бюлетэнь "Літаратура па педагагічных навуках і адукацыі, якая паступіла ў бібліятэку ў ..." (з 1967 г. па 1995 г.) штоквартальна забяспечваў бягучае бібліяграфічнае інфармаванне. З 1996 года памянёны агульнагаліновы паказальнік быў заменены на комплекс тэматычных анатаваных спісаў новых паступленняў, што друкуюцца ў педагагічных перыядычных выданнях: "Настаўніцкай газеце", часопісах "Пралеска", "Пачатковая школа", "Адукацыя і выхаванне" (з 1997 года), а таксама 20-ці штоквартальных часопісах-дадатках да яго (з IV кв. 1995 г.).

У двух часопісах-дадатках да "Адукацыі і выхавання" — "Вышэйшая школа" і "Гісторыя: праблемы выкладання" — анатаваныя спісы не друкуюцца.



Репозиторий БГУКИ

У штомесячным бібліяграфічным бюлетэні "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку" (выдаецца з 1960 г. Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі) у якасці дадаткаў змяшчаюцца падрыхтаваныя РНПБ анатаваныя тэматычныя рэкамендацыйныя спісы па розных аспектах адукацыі. З 1997 г. павялічыўся аб'ём анатаваных крыніц у кожным са спісаў (да 25—26 назваў).

Рэтраспектыўнае бібліяграфічнае забеспячэнне педагогаў і псіхолагаў адлюстравана ў двух выданнях: "Асвета ў БССР за 50 гадоў Савецкай улады" (1975) і "Педагагічная навука і народная асвета ў БССР" (1990). Першая крыніца ахоплівае перыяд 1918—1967 гг., другая — 1968—1982 гг. У апошні час РНПБ рыхтуе працяг рэтраспектыўных паказальнікаў у камп'ютэрным варыянце —"Педагагічная навука і народная асвета ў Беларусі". Яны ахопліваюць перыяды 1983—1987 гг. і 1988—1992 гг.

Для практыкаў у галіне адукацыі на працягу 1968—1994 гг. РНПБ надрукавала звыш 90 тэматычных бібліяграфічных выданняў. У бібліяграфічнай прадукцыі РНПБ адлюстроўваюцца новыя тэндэнцыі генезісу сістэмы адукацыі Беларусі: рэформа зместу навучання і выхавання ў навучальных установах розных тыпаў, дыферэнцыяцыя навучання. РНПБ плануе ствараць зводныя паказальнікі зместу беларускіх навукова-метадычных часопісаў у галіне адукацыі за апошнія тры—пяць гадоў.

Дзеля вывучэння інфармацыйных патрэб навукоўцаў і спецыялістаў адукацыі РНПБ выкарыстала ў 1992—1993 гг. карту бібліяграфічнага забеспячэння галіны, распрацаваную навукова-бібліяграфічным аддзелам НББ. Яна дазволіла выявіць неабходнасць храналагічнага працягу выдання асобных дапаможнікаў, а таксама намеціць прыярытэтныя напрамкі развіцця бібліяграфічнай інфармацыі па педагогіцы і псіхалогіі.

Яшчэ адным буйным цэнтрам з'яўляецца Нацыянальны інстытут адукацыі (НІА) Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Ён выдае 8 серый анатаваных бібліяграфічных паказальнікаў навукова-педагагічнай

літаратуры: "Псіхалогія навучання і выхавання" (з 1995 г.), "Агульныя пытанні адукацыі і педагогікі", "Выхаванне", "Спецыяльныя школы і дэфекталогія", "Дашкольнае выхаванне і педагогіка", "Педагогіка агульнаадукацыйнай школы", "Педагогіка прафесійна-тэхнічнай сярэдняй спецыяльнай адукацыі" (усе з 1996 г.), "Вышэйшая адукацыя і павышэнне кваліфікацыі" (з 1997 г.). Асобным выданнем надрукаваны ў 1997 г. анатаваны бібліяграфічны паказальнік навукова-педагагічнай літаратуры "Дыягностыка ведаў" (усё — на рускай мове). Кожная серыя змяшчае інфармацыю аб кнігах, аўтарэфератах дысертацый, зборніках навуковых прац, інструктыўна-метадычных дакументах на падставе электроннай базы даных фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, буйнейшых рэспубліканскіх бібліятэк.

НІА ажыццявіў першую спробу стварэння фундаментальнага бібліяграфічнага паказальніка па гісторыі адукацыі ў Беларусі на працягу тысячагоддзя (IX — пачатку XX ст.), які быў надрукаваны ў дзвюх частках пад назвай "Асвета і педагагічная думка на Беларусі: са старажытнасці да пачатку XX ст." (1995 г.). Ён змяшчае велізарны інфармацыйны масіў дакументаў і літаратурных крыніц на кірыліцы і лацінцы, знойдзеных у архівах і бібліятэках Мінска, Гродна, Вільні, Масквы, Кіева, Львова. Рубрыкацыя гэтага выдання мае на мэце наступнае — адлюстраваць характэрныя з'явы кожнага з гістарычных этапаў развіцця адукацыі (дзяржаўнай палітыкі, тыпаў школ, падручнікаў, педагагічнага руху, персаналій). Дадаецца тут і спіс доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па ўказанай праблематыцы.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) падрыхтавала рэтраспектыўны комплексны бібліяграфічны штогоднік "Новая літаратура па гісторыі і гістарычных навуках Беларусі", які выдаваўся ў 1992 і 1993 гг. Інфармацыю для педагогаў і псіхолагаў у названай крыніцы змяшчае раздзел "Гісторыя асветы і педагогікі". У іншым комплексным бібліяграфічным паказальніку, "Чарнобыль"

(выдаваўся ў 1993 і 1994 гг.), знаходзіцца педагагічная і псіхалагічная інфармацыя ў раздзелах "Чалавек", "Грамадства", "Дзеці Чарнобыля".

Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання (НМЦ ВК і СН) Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь штогод распаўсюджвае па навучальных установах краіны планы-праспекты вучэбных дапаможнікаў, якія рыхтуюцца да выдання. Гэта дае магчымасць навучальным установам рабіць заяўкі на патрэбную літаратуру. У 1998 г. лабараторыя выхаваўчай работы НМЦ выдала невялікі буклет пад назвай "Нацыянальныя падручнікі: метадычная літаратура па выхаваўчай рабоце", дзе быў змешчаны бібліяграфічны спіс (42 назвы) за 1995—1997 гг.

Акадэмія паслядыпломнай адукацыі выдала "Інфармацыйны бюлетэнь аб матэрыялах педагагічнага вопыту" (1989 г.) і "Інфармацыйна-бібліяграфічны каталог" (1994 г.). Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі (РІПА) выдаў у 1996 г. "Інфармацыйны даведнік РІПА". Віцебскі абласны Інстытут перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі надрукаваў інфармацыйны бюлетэнь "Анатаваны паказальнік адрасоў перадавога педагагічнага вопыту" (1998 г.) і "Пералік выданняў, прадстаўленых на выставе "Выхаванне: праблемы, вопыт, перспектывы" (1998 г.).

Брэсцкі дзяржаўны педагагічны універсітэт у 1991 г. выдаў тэматычны рэтраспектыўны "Зводны каталог літаратуры па гісторыі нацыянальнай школы ў Беларусі", дзе адлюстравана 300 назваў крыніц з бібліятэчных фондаў.

Сучасны стан бібліяграфічных выданняў для педагогаў і псіхолагаў Беларусі ўяўляе шматузроўневы галіновы комплекс, які мае шэраг добрых якасцей і недахопаў. Да ліку істотных недахопаў можна аднесці наступныя: а) бібліяграфічныя выданні не паспяваюць своечасова асвятляць новыя напрамкі развіцця педагогікі і псіхалогіі; б) большасць бібліяграфічных крыніц не змяшчае аналітычных анатацый на актуальныя кнігі, главы кніг,



Рэпазіторый БГУКІ

артыкулы, што вядзе да страты значнай часткі інфармацыі для карыстальнікаў; в) бібліяграфічная інфармацыя па псіхалогіі (у параўнанні з педагагічнай бібліяграфіяй) да гэтага часу не адлюстравана ў самастойнай галіновай бібліяграфічнай крыніцы; г) біябібліяграфічныя і персанальныя паказальнікі пакуль не распрацоўваюцца ў Беларусі на адпаведным узроўні.

Важнымі якасцямі бібліяграфічнага забеспячэння педагогаў і псіхолагаў Рэспублікі Беларусь у наш час лічым наступныя:

1) з'яўленне ў апошнія гады шматлікіх цэнтраў, якія ствараюць бібліяграфічную інфармацыю па розных аспектах дзейнасці спецыялістаў сістэмы адукацыі, іх энтузіязм у гэтай галіне;

2) узнікненне ў рэспубліцы бібліяграфічнага рэпертуару (фундаментальных рэтраспектыўных бібліяграфічных паказальнікаў, якія асвятляюць гісторыю педагагічнай думкі ў Беларусі); 3) укараненне ў шэрагу пералічаных цэнтраў новых інфармацыйных тэхналогій у сувязі з узніклай сацыякультурнай сітуацыяй.

Цяпер у галіновай бібліяграфіі па педагогіцы і псіхалогіі актуальным робіцца асвятленне наступных праблемных аспектаў: гуманізацыі, гуманітарызацыі адукацыі, функцыянавання альтэрнатыўных тыпаў навучальных устаноў, аўтарскіх адукацыйных праграм і методык, псіхадыягностыкі, псіхакарэкцыі, методыкі выкладання псіхалогіі і інш.

Репозиторий БГУКИ